Людміла Паўлікава

АДВЕДЗІНЫ РАМОНКАВАЙ ПАЛЯНЫ







ЛЮДМІЛА ПАУЛІКАВА НАРАДЗІЛАСЯ
У 1952 ГОДЗЕ У ПАСЁЛКУ ЯЛІЗАВА
МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ.
СКОНЧЫЛА
ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ
БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.
ПРАЦУЕ Ў БЕЛАРУСКІМ
НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ
АРГАНІЗАЦЫІ І КІРАВАННЯ БУДАЎНІЦТВАМ.
УДЗЕЛЬНІЦА
VIII УСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЫ
МАЛАДЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ 1984 ГОДА.
ВЕРШЫ ДРУКАВАЛІСЯ
Ў ЧАСОПІСАХ «ПОЛЫМЯ», «МАЛАДОСЦЬ»,
У АЛЬМАНАХУ «ДЗЕНЬ ПАЭЗІІ»
І Ў РЭСПУБЛІКАНСКІХ ГАЗЕТАХ.



ПЕРШАЯ КНІГА ПАЭТА

Людміла Паўлікава

АДВЕДЗІНЫ РАМОНКАВАЙ ПАЛЯНЫ

Вершы

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1985

Бел 2
П 12

Зборнік рэкамендаваны да друку секцыяй паэзіі Саюза пісьменнікаў БССР

Рэцэнзент Раіса Баравікова

П $\frac{4702120200-012}{М 302(05)-85}$ 88—85

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1985.

ПА ДАРОЗЕ Ў ЯЛІЗАВА

Бярэзіна зірне, мільгне дуброва,
І праплывуць сасновыя бары.
Кассё прыхлыне пахам чабаровым,
Антонаўкамі стрэнуць Сталяры.
Усе гады я вам была адданай,
Настаўнікі мае,— лясы, палі!
Прасветленай рамонкавай палянай
Лікуй, душа мая, душа мая, балі!
І не надыхацца мне тут,
Не надзівіцца,—
Займае дых пяшчотаю бяроз.
Спляліся над марудлівай крыніцай
Арэшына і сціплы вербалоз.
Тут рэха слоў, якім вучыла маці,
Гучыць у назвах, спеве збажыны.
І радасці дзіцячай не стрымаць мне —
Вартуюць луг рабыя бацяны.

СПАДЧЫННЫЯ КРОСНЫ

Бабуля ткала ручнікі,
І я нібы дапамагала:
Чаўнок хапала з-пад рукі
Ды нецярплівасцю даймала:
— Навошта столькі ручнікоў?
На ўсіх вяскоўцаў хопіць з гакам!

Бабуля ткала, час ішоў.
А мроі ўсе — былі за ганкам!
Там, дзе чакае рэхву брук,
Дзе рэха воклік мой паўторыць,
Там, дзе гарэзлівы раўчук
Мне радасць звонкую падорыць.
Час набіраў разгон цішком —
Туды, дзе люд яднаюць мары:
Адным віткам,
як ручніком,
Аперазаў Зямлю Гагарын...
І праз гады, нібыта крык,
Працяла думка нечакана,—
Што гэты велічны ручнік
Бабуляй быў наканаваны!
...Бабуля ткала ручнікі...
Яе навука не прапала:
Я сёння тку свае радкі,
Каб больш сяброў на свеце стала.

ПАРТЫЗАНСКІ ДУБ

Дарога ўпартым рогам
Працяла небакрай.
Праводзь мяне, дарога,—
Дарога, сустракай,
Да сіняе дубровы
Вядзі за далягляд,
Дзе волат стогадовы
У думе хмарыць бровы,
А госцю будзе рад.
Хай госць там і ў пашане,

Размова спехам — тлум.
Таму, хто паспяшае,
Дуб не паверыць дум.
Ён за плячыма веку
Трымае шмат падзей.
Іду к жывому сведку
І часу і людзей.
Мяне, яшчэ малечу,
Мой бацька вёў туды.
Пяшчотна ўзяў за плечы
І мовіў мне тады:
«Запомні, дуб, дачуля,
Для нас ён быў, як бог.
Не раз прымаў ён кулі,
Што цэлілі ў наш бок.
Нас, партызан, нямала
Ён ратаваў падчас.
Снарадам ссекла рала,
Якім закрыў ён нас.
І, кулямі шчапаны,
Наш дуб з фашыстаў кпіў.
Мы зналі нашы раны.
А хто ў яго лічыў?
Запомні дуб, дачуля,
Для нас ён быў, як бог.
Не раз прымаў ён кулі,
Што цэлілі ў наш бок...»
Як час наш хуткацечны.
Нясу сваю бяду.
Да сённяшняй сустрэчы
Без бацькі я іду.
І вось я на паверцы,
Хоць дуб і не чакаў.
Стаіць у паняверцы.
...Сухое рала ў сэрцы,
Нібы пусты рукаў...

І раптам затрымцелі
Каляныя лісты
І мне прашапацелі:
«Ну што бядуеш ты?
Хоць боль твой паважаю,
Ды ўсё-ткі пачакай,
Бо наша моц не ў жалю,—
Будзь мужнаю, дачка».
Нібыта подых ветру
Крануўся ў спёку губ.
Табе, герою-сведку,
Паклон, як чалавеку,
Неперагможны дуб.

БЕЛАРУСЫ

Пачэсна дзялілі з зямлёй цяжар —
Вырасціць хлеб златавусы,
Таму з пачціваcцю: «Гаспадар» —
Зваў беларус беларуса.

Ды хлеб, здабыты сялянскай рукой,
Знатны засек няволіў,
І толькі боль заставаўся свой,
І толькі гнеў заставаўся свой,
І толькі спеў заставаўся свой —
Насеннем бунтоўнай долі.

На ростанях двух грымотных вякоў
Зямля заспявала ўголас:
Насустрач жыццю прарос з акоў
Песняй зямлі — Колас.

...За рунню рунь набіраецца сіл,—
Краю рунець бясконца!
...Да сонца цягнуцца каласы,
Промні зямлі — да сонца.

ПА ЗОРКАВУЮ ДОЛЮ

Кладзецца летні морак.
Злятае светлы сум.
Дадому вёдры зорак
Паўнюткія нясу.
Сцякае золкасць долу
З падолу
Па нагах.
Я зоркавую долю
Шукаю па начах.
І па зямлі прагрэтай,
Набраўшы кветак кош,
Са мною поруч лета
Ступае басанож.

СНЕГ У КАНЦЫ КРАСАВІКА

Апошні снег, бялюткім хараством
Не выклікаеш радасці звычайнай.
Таполям і дамам невыбачальна
Ты светлы сум навеяў за акном.
Якую навіну прыносіш мне?

Апошні снег, навошта непакоіў?
І я спяшаю да завейных мрояў —
Не доўгі век у снега па вясне.
Чаму зрываю хустку з галавы? —
Навошта мне адчай зімовай весткі?
Зляцеў на плечы, нібы да нявесты,
Празрыста-белы вэлюм снегавы.
Да твару снег далонямі ўзніму
І адвяду збянтэжаныя вочы:
Спазніўся ў свет на цэлую зіму,
Спазніўся да мяне на век жаночы.

* * *

Прамень дрыжаў, цягнуўся да вады,
Танклявыя галінкі зміналі.
Штораз у лісцвяныя невады
Трапляла прага прамянёвай хвалі.
Ды рушыў зноў адчайны, трапяткі
І адступаў, каб спрабаваць з размаху.
Я расхінула куст каля ракі,—
Ляці, прамень!
І мне вядома смага.

НА СУІ

У рупар крычалі:
— Лодкам прычаліць!
Шторм!
Перада мной — немаўля!
Бунтарства навала
Ўва мне панавала —
Адчаліла лодка мая.

Возера Суя,
Я не спасую,
Мой неспакой забяры!
Возера Сую
Лодка прасуе.
Хіляцца долу бары.

Насустрач імчалі
Лагодныя далі.
Якая іх сіла вяла?
І штосьці хавалі
Гняўлівыя хвалі
Пад ціхім ускрыкам вясла.

Наперад! Наперад!
А далеч не змераць.
Ну, лодка, трымайся цяпер!
О, як трэба вера,
Што недзе ёсць бераг,
Што хтосьці чакае цябе!

НОРАЎ ВОСЕНІ

З якой бяды ці з радасці якой
Сваволіць рыжая маркотніца, няволіць.
Дажджы, туманы запрашае чарадой,
Нібы адвеку смагі не натоліць.
На квінтах электрычных правадоў
Зайграць мелодыю вятрыску загадае.
То ад журбы нятомленых палёў
Збяжыць у лес і голле загайдае,—
Зрывае ўбор, што ладзіла сама,
Не пашкадуе ні дубровы і ні гаю,
То зразумее, што буяніла дарма,
І горка-задуменна заціхае.
А то лістом засвеціцца ў імжы,
Ахопіць сумам з немаведамай прычыны
І пасміхнецца вінавата скрозь дажджы,
Зусім як улюбёная жанчына.

НЕПАГОДНЫМ ДНЁМ

Эх, дзікунка-прырода!
Непагода з адчаем
Свой рэванш за паўгода
На зямлі адзначае.

І старая лясіна
Гнецца, крэкча ад ветру:
— Вось нячыстая сіла!
Гэй! Нягожа так лету!

Гараджанін шкадуе:
— Што рабіць з адпачынкам?

І вясковец бядуе:
— Хоць дзянёк бы дажынкам!

Нават рукі ўспацелі
У папрадухі ад мары:
— Каб нябеснай кудзелі
Не хапіла на хмары!

Дзед на сонца з напасцю:
— Рэўматызм табе ў косці!
Як да нас, дык з нянасцем?!
К Маякоўскаму ў госці?!

З растрапаных аблокаў
Тварык сонца спрасонку
Паглядае здалёку
На кругі парасонаў.

Нібы тая бабёнка,
Што ўсю ночку куціла,
Залатую грабёнку
Дзе згубіла, свяціла?

* * *

— Мама, дай квяцістай хусткі?
— Вось гарэза-непаседа!
І куды ты?
— Буду хутка.
— Ну а ўсё-ткі?
— На бяседу.
— Пачакай, пірог спякла я,

Як жа так — без анічога?
— Мама...
— Слухайся, малая,
Да людзей ідзеш, нябога!
— Не збірай нічога, мама,
Там мяне і так прывецяць.
Там з пары нязнанай брама
Прарасла зялёным веццем.
Дываны ў жывых суквеццях
Ткалі там зямныя кросны.
Там бярозам статным вецер
Расплятае жвава косы.
Там абрусы сцелюць травы,
Там чмялі-музыкі граюць,
Там не п'юць дзеля забавы,
Там не кленчаць і не раяць.
Там глядзяць у вочы кветкі
Па-дзіцячаму аддана...
— Ды куды ж ты?
— У адведкі
Да рамонкавай паляны!

ВЯРТАННЕ ДА РАМОНКАВАЙ ПАЛЯНЫ

Ваду рассякаюць пругкія рукі,
Мігцяць палахлівыя цені...
Краю мой любы,— зялёныя лукі,
Зноў да цябе заляцела!
Золкія кроплі сцякаюць долу.
— Дабрыдзень зялёнаму свету!
Мір майму зялёнаму дому! —
Гукаю насустрач ветру.

І праз кусты парэчкі дзікай
Бягу да бяроз апантана.
...Ахнула здзіўлена
Душой санцалікай
Рамонкавая паляна.

АБУДЖЭННЕ

— Ці не з мар Вы?
— Я з хмар.
— Мабыць, кропля дажджу веснавога?
— Не многа.
— Вы — маланка! Прашу Вас,
не згасніце толькі ніколі!
— Я — болей!
— Перунова грымота,
што мяне ўскаланула з паветрам?
Гучыце ж бясконца!
— Ці гадаць ёсць ахвота?
Уначы хмары вымела ветрам.
Прачынайся.
Я — сонца!

* * *

Чакала цябе,
нібы голасу песня,
воклічу рэха,
світанку зямля...

Шукала падчас,
як сцябліна святла.
Я зорак званамі
гула ў паднябессі.
Я сонца цяжар
уздымала на плечы,
каб высвеціць,
бачыць цябе.
Пасля
чакання напятая цеціва
дрыжала.
Здавалася,
поруч ідзеш,
зусім блізка.
І я памылялася.
Не! Памірала.
І зноў нараджалася,
каб нарэшце знайсці цябе.
...А ты не здзівіўся,
што я з'явілася.
Цяпер прыходжу да цябе
і, перш як прывітацца,
з таемнай трывогай пытаюся:
не спазнілася?

* * *

Тры прыступкі —
твае і мае.
Твае — вяртанне.
Мае — вяртанне.
А як нам

мужнасці не стае
на развітанне,
на развітанне.
Тры прыступкі —
твае і мае.
Нязнойдзеным словам
звініць маўчанне.
А як нам
мужнасці не стае
на крок адчайны,
на крок адчайны.
Тры прыступкі —
твае і мае.
Пляцоўка лесвічная.
Вагі ваганне.
А як нам
мужнасці не стае
і на чаканне,
і на чаканне.

* * *

Пад коламі спеў асфальта,
Пад коламі лёс пяе.
Дарогі спіна пукатая,
А што за хрыбтом яе?
Дарога і зноў дарога.
Бясконцасць займае дых.
А нам і не трэба другога,
А толькі была б дарога,
А толькі б вяла дарога
Падалей ад вока чужога,
Дзе будзем з табой удваіх.

* * *

Травы духмяныя,
Думкі туманныя.
Рукі рахманыя,
Непаслухмяныя.
Смагай палючаю
Губы агучаны:
Травы гаючыя,
Травы-заручыны,
Дайце яднання
Цел апантаных,
Боль прывітання —
Плата пазнанню.

АЛЕ...

Я помню час, калі ваш твар збялеў,
І дотык рук, дрыготкіх у адчаі.
Вы абяцалі слодыч мне, але...
Аб тым, што з гаркатою, прамаўчалі.

Я помню, ранак за акном залеў.
Вы мне сказалі: «Колькі ж мы знаёмы?
Цярпенне. Будзе добра ўсё». Але...
Прайшлі гады, не ведаючы стомы.

У вашых словах чую зноў ялей,
І гаркаты, і слодычы праз меру.
І рада б не паверыць Вам, але...
Я так даўно і так аддана веру.

* * *

Яшчэ чутно
цяпло далоні.
Узрывы крокаў
шчэ не заглухлі.
І ветравыя
імчацца коні
Па буйных кронах,
па травах жухлых.
Гарачы цокат
пульсуе ў скронях.
Апошні дотык
нясуць вятры.
Ды спатыкнуліся,
палі коні
Там, дзе буяюць
кустоў кастры.
Ідзеш у восень...
Гукай, прастор!
Адно прашу —
не азірніся!
Здыміце, дрэвы,
з галоў убор!
Здыміце лісце.
Не азірніся...

КАЗКА

Дзе ты,
казка мая прамяністая?
Коле сэрца
яліна іглістая.

Боль нясцерпны.
Мне б песню
ці крык знайсці.
Як мне дыхаць?
Як жыць?
І куды ісці?
Не малю, не кляну,
бо не вернецца,—
Мне і верыцца і не верыцца.
Не сагрэе сляза
сэрца ласкаю.
Дзе была?
Чым жыла?
Дзіўнай казкаю!
Сонца лезе
на сук
вешацца.
Хто чужой бядой
усцешыцца?
Прамяні крануць
край адзення зямлі —
Забіваюць яны
нас надзеямі.
Кроў бунтоўная
стала чорнаю —
Налятае ноч
зграяй зорнаю.
Свішчуць мётлы вятроў
каля весніц.
Замест сонца
ўначы — плямай месяц.
Вы чаго,
зоркі дальнія,
прагнеце?
Што душу маю
зноў вы цягнеце?

Як з бяздоннем мне
сілай мерацца?
Ды ўсім думкам назло
ў казку верыцца!

* * *

Ці было?
Мне не верыцца ў гэта!
Хвоі пах,
Прага весняга ветру?
А душа —
Са святла і паветра?
Скрозь дажджы
Усміхнулася лета
Ды пайшло.
Ці было?

* * *

Я не прыйду,
Хопіць, думкі, вам ра́іцца —
Шчасце знайду ці бяду?
Я не прыйду.
Ззяе росамі раніца,
Лугам асеннім брыду.
Я не прыйду.
Гукі музыкай раняцца.
Я не прыйду,
Не збылася абранніца.
Я не прыйду.

* * *

Абудзіць пацалункам на золку...
Прычакаць да вячэры з работы...
Уначы наталіць прагу дотыку...
Ні ноч Вам.
Ні дзень.
Ні раніца.
Урываем хвіліны спатканняў
з чэпкіх рук мінулага.
І ўсё ж —
у мінулым жывем,
мінулым думаем,
мінуламу ахвяруем.
Бо там — у мінулым —
жонка была чараўніца.
Бо там — у мінулым —
добры пагляд мужа.
Бо з мінулага і па сягоння
кранаюць нас
даверлівыя рукі сыноў.
Сыноў, якіх пакідаем
на хвіліны спаткання.
Так нарадзілася
штодзённае пачуцце віны.
Віны за хвіліны іх адзіноцтва.
Віны яшчэ за нешта,
чаму не можам знайсці імя.
...Вяртаюся дадому.
Цалую бліскучыя вочы сына.
Не ведаю, як пазбыцца гэтай віны.
Не ведаю, як адначасова наталіць
прагу бачыць яго, абараняць
і прагу сустрэч з другім —
таксама адзіным.
Штодзённае пачуцце віны...

За сустрэчы,
без якіх не было б паловы мяне,
за сына,
без якога губляю і астатняе.
...Штодзённае пачуццё віны...
І, каб не зрабіцца вар'яткай,
раблю выгляд,
запэўніваю сябе,
што ўсё добра,
усё — як мае быць.
А часам ахопіць жах:
«Мо гэта і ёсць вар'яцтва?»
...Ні дзень Вам... ні ноч... ні раніца...

КАРА́ЛІ

Адшумелі, адгукалі
Крутаверхія бары,—
Там згубілі мы каралі,
Што мне татка падарыў.
Ночку цэлую шукалі.
«Не гаруй!» — ты гаварыў.
І з рабінак мне каралі
На світанні падарыў.
А рабінкі хутка звялі,
Як дзявочы мой парыў.
Я забыла пра каралі,
Пра світальныя бары.
І гады не дакаралі
Да сягонняшняй пары:
У руках маіх каралі,
Ды ніхто іх не дарыў!

* * *

Ізноў я казку
З маны ствараю,
Не дакараю,
А за акном
Аб чымсьці плача
Лаза старая.
Паплачам разам,
Заходзь у дом.
Мы пашкадуем
Адна другую...
Чакай! Дык гэта —
Сябе шкада?
Такой жалобе
Я не дарую!
Усмешку-выклік
Сустрэнь, бяда!
...І гнеў раптоўна
Мой боль скарае,
І пакідае самота дом...
Аб чым ты плачаш,
Лаза старая?
Папраў прычоску,
Бог з ім — дажджом!

НА СУСТРЭЧЫ ВЫПУСКНІКОЎ

Выпраменьваюць вочы святло.
Захінуся, як калісь, касою.
Колькі вёсен у нас адышло? —
Маладыя сталеюць вясною.

Запрашаюць дзяўчат танцаваць...
Сум на плечы прысеў. Вось навала!
Памяць, хопіць ужо дакараць!
«...Цалавала цябе, цалавала...»
— Ты дазволіш?
— З прыемнасцю! Я...
Паплыла і падлога і зала...
— Як жывеш ты, дзяўчынка мая?
«...Цалавала цябе, цалавала...»
— У ружовым святле, як заўжды?
— Ні аб чым не шкадую німала.
— Выбачай, я быў дурань тады.
— Ну, а я разумнейшай не стала!
— Гэта добра. Ты замужам?
— Так.
Сцяла вусны маўчанне трывала...
«Не маўчы! Я схлусіла, дзівак!
...Цалавала цябе... цалавала...»
Выпраменьваюць вочы цяпло.
Захінуся, як калісь, касою.
Колькі вёсен ад нас уцякло? —
Мы цяпер маладзеем вясною.

* * *

Яшчэ не ведаю я,—
Хто ты?
Прыйшоў ка мне з дабром
Ці злом?
А вежа гордай адзіноты
Бяздумна просіцца
Назлом!

Яшчэ не ведаю я,—
Хто ты?
Чаму ж ка мне ты
Не спяшаў?
А над сумётамі самоты
Вясновай кнігаўкай —
Душа!

Маэстра, прэч адкіньце
Ноты,
Калі спяваюць
Камяні,
Гучаць аркестрам прамяні!
...Яшчэ не ведаю я,—
Хто ты?

ТАБЕ

Не дарыў ані стужкі,
Каб мяне зберагчы.
Песню, дзіўную птушку,
Пасадзіў на плячы.
Не схавацца ў бяседзе
І ні ў сне паначы,
Цішыня ў цэлым свеце,
А яна не маўчыць!
Круг чароўны акрэслю —
Зазвініць угары.
Забяры сваю песню
Ці мяне забяры!

* * *

Ёсць горыч у апошняе любові,
Бо мудрасць год падкажа, што на долю
І радасці і шчасця — страты, болю
Не мінаваць апошняе любові.
І радасць адкрыцця, і дотык шчасця
Атруціць вопыт нам услужліва міжволі.
Але, мой лёс, прашу ў цябе заўчасна
І палыновае апошняе любові.

* * *

Калі раптоўна пахіснуся,
Не пашкадуй мяне міжволі.
На гэты жаль я зазлуюся,
Але зайсціся б лепш ад болю.

Калі раптоўна пахіснуся,
Ты не зняваж мяне міжволі.
На гэту крыўду я ўсміхнуся,
Але зайсціся б лепш ад болю.

Калі раптоўна пахіснуся,
Ты не заўваж мяне — май волю.
Каб зноўку мне не спатыкнуцца,
Хай сэрца зашчыміць ад болю.

* * *

— Пойдзем, пойдзем, сынку.
Адлятае вечар.
Зорнаю хусцінкай
Туліць ночка плечы.
Пойдзем, пойдзем, сынку,
Пойдзем, калі ласка.
Накармлю я сытна
І нацешу казкай.
Пагуляеш ранкам,
Час ісці дахаты.
— Мамачка, а раптам
Нас не знойдзе тата?
— Пойдзем, сынку, годзе,
Ён цяпер далёка.
Не хвалюйся, знойдзе,—
Ён вялікі дока.
Пойдзем, пойдзем, сынку.
Штосьці золкі вечар.
...І мацней хусцінкай
Туліць маці плечы.

БУДЗЕНЬ АДЗІНОТЫ

Чаго, званок, маўчыш зацята?
Не вінаваць, не наракай.
Жыву ад свята і да свята
Аб'явы звонкай:
— Сустракай!
Надзея, векавуха цуда,
Хоць ты мяне не пакідай,
Мая салодкая атрута!

Зноў адзіноты — цераз край.
О, бессаромнасць адзіноты,—
Душы без вопраткі прыкрас!
Зноў прад сабой трымаць адказ:
Па што прыйшла ты? Хто ты? Што
ты?..

* * *

Ушчувала мама: «Дзеўка,
Не гуляла б давідна!»
Маладосць, нібы прыпеўка.
Ох, кароткая ж яна!

Не ў самоце-адзіноце
Варушу сваю душу,
А па ўласнае ахвоце —
То чытаю, то пішу.

І на ўсе рахункі спорны:
Змесціць кнігі, хлеб і соль,—
Пунктам дзейснае апоры
Стаў стары кухонны стол.

Рады сябру, сустракае,
Толькі раптам — хітры ліс! —
Зварухнецца, дакарае
Чысты ліст ці кніжны ліст.

Як святло пагаслай зоркі,
Што яшчэ ідзе да нас,
Грэк-філосаф з імем звонкім
Праз вякі зірне падчас.

Тут зямлі маёй паданні
Ад Дняпра і да Дзвіны,
Нібы хвалі плёскат дальні —
Горды гоман даўніны.

Тут стракатая газета,
Дзе артыкул і памфлет,
Бюлетэні пра паўсвета
І прадстаўлены паэт.

Завітае, скажа мама:
«Што сядзіш усё адна?
Паглядзі, змарнела прама!
Лепш гуляла б давідна».

ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ

Дакрануцца да імгнення.
Завязаць прасцяг у вузел.
Станам хісткіх летуценняў
Растрывожыць думак вулей.
Прыгадаць усе высновы.
І адкрыць адсутнасць ісцін.
І ва ўласнае калысцы
Гадаваць жыццё нанова.
Каб нязбытнаму там збыцца,
Кожны дзень і крок адточваць.
І аднойчы... памыліцца,
Што ж ты гэтакае, творчасць?

НА БЕРАЗЕ БУГА

На іншамоўную зямлю
За Бугам сонейка сядае,
На ноч, нібыта на зіму,
У вырай птахам адлятае.

Мой краю родны, ты збярог
Магілы продкаў і быліны,
Крыжы на ростанях дарог,
Зубрыны рык і грай птушыны.

Што мы без іх? Адкуль прыйшлі?
За што ад госця нам павага?
У нашых жылах — сок зямлі,
Яе руплівасць і адвага.

А час ідзе. І што ні год
Нібы прысуд свой выракае.
Часцей, чым вабны карагод,
Лезгінку бачыш, любы краю.

І смех, і грэх, але даўно
Мы — бульбашы. Мы, беларусы.
Бо час не крадзе ў нас адно
Пахучай бульбы на абрусе.

Ірвецца ў горкі роздум мой
Жывых званочкаў шматгалоссе.
Адкуль ты, дзіва, узялося? —
Пяюць дзяўчаты над ракой...

ДАКОР ЗУБРУ

Тут не была.
Ды прывідна-знаёмы
Прасцягі брэсцкае славутае зямлі.
Сягоння мы ў дарозе, нібы дома,—
Дадому ўсе дарогі павялі.
Рунее дол пачэснай доляй жытняй:
Самаахвярна класціся пад цэп.
На беларускай ніве старажытнай
Салдат жыцця —
Наш бела-русы хлеб.
Пастух нябачны на жалейцы грае...
Аціхні, гул натруджанай шашы!
Сама зямля спявае ў гэтым краі.
Ну пачакай, аўтобус, не спяшы!..
Вякі мільгаюць пад гаворку гіда.
Раскуты краю!
Шматпакутны край.
Тут Белай Вежай урасла карыятыда,
Трымае над Еўропай небакрай.
Хоць чужакі не раз ішлі на прыступ,
Крышылі зубы, зброю аб яе,
Ды з чужакоў — адно яму, турысту,
Расчыніць дзверы цяжкія свае.
А вось і пушчы абымшэлай сосны —
Вячыстыя, дрымучыя бары.
Пяцьсот гадоў назад
Апетыя Гусоўскім,
Насустрач крочаць волаты-зубры.
Шанцуе нам —
Зубры за агароджай!
Такое бачыць толькі лесавік.
Ідуць зубры.
Нам боязна і гожа.

Казыча нервы моцны, сіплы рык.
І тут дзяўчына булку разламала,
Бліжэйшаму за жэрдзе:
— На, бяры!..
Бярэ з далоні,
Мыкае, што мала.
...На тых зубрах аброці не хапала.
Трымайцеся, вас запрагуць, зубры!

ПРОМНІ І КАМЯНІ

Было.
Мне злом пацэлілі знянацку.
Усё плыло.
Казаў мне штосьці бацька.
Гаворка простая,
бы плёск рачной вады,
спачатку слых, а потым розум, сэрца
запоўніла.
І чула я тады:
«Жыццё — не чаравік,—
не зробіш па прымерцы.
І ў драпінах не цела,
дык душа.
Але і ўсё чарніць не паспяшай.
Адмыць цяжэй,
таму і пачакай,
шчэ набудуеш паветраных палацаў!
У непагадзь і ў горы нас, дачка,
адзінае ратуе — гэта праца.
Зла не трымай.
І долю не няволь, не пагарджай,
бо й тая сыдзе з дому.

Але запомні добра ўласны боль,
каб не зрабіць і незнарок другому.
Лаві душою промні дабрыні,
бо ёй адною чалавек багаты.
Няхай святло пускае карані.
Ты за яго не патрабуй адплаты!
Рабі, прымай сапраўднае дабро,
надзеленае сонечнай прыродай —
калі падзякі не чакаеш і дароў,—
яно найлепшай будзе ўзнагародай...»
...Калі ў душы каменне зла згадаю,
зацяўшы зубы, выберу датла.
А ноша неадплатнага дабра —
усё цяжэй становіцца з гадамі.

ТРЫШЦІХ НЕБА

Двойчы Герою Савецкага Саюза
касманаўту У. В. Кавалёнку

Розумам да неба

— Мама, ты што — у бога верыш?
— Але, мой сынку, ты бог мой першы.
— Хітруеш. Чаго ж казала «дай божа»?
— На гэтым, сынку, лавіць нягожа.
Гэтыя словы па звычцы ці жартам
Лезуць цяпер у гутарку ўпарта.
Рукі, узнятыя з верай да неба:
— Даху!
— Вады!
— Літасці!
— Хлеба!

Рукі пустыя багам не трэба —
Крывавых ахвяр дамагалася неба.
Брала кавалак апошні і зрэб'е —
Пагарды не ведала сквапнае неба.
Ва ўлонні гісторыі нараджаліся, чахлі
Цэзары,
папы,
цары,
шахі!
Як час непазбыўнае, поўнае зданяў,
Вяршыла неба сусветныя тайны.
І вось —
Галілеі,
Ікары,
Дзедалы
Розумам тайну нябёс разгайдалі!
Знята з неба адказнасць за жахі,
Якія сеялі
цэзары,
шахі...
Ужо не стыхіі кіруюць светам —
Прага пазнання, зорная мэта.
І вось на абліччы дзёрзкага веку —
Касмічны росчырк рукой чалавека!
Знікла вера — душаў калецтва!
Сапраўдная вера — у чалавецтва!
У нас, бы ў антычнасці, шмат багоў:
Шчырасць,
братэрства,
праўда,
любоў!

Сэрцам да неба

Розум без сэрца —
Робат.
Розуму без сэрца —
Не верце!
Лодку розуму
Праз рокат стыхій
Кіруе вясло — сэрца.
Не.
Зараз меркі другія
Патрабуе касмічная эра:
Неба неабсяжнае —
Сэрцу чалавечаму мера.
Мноства вякоў аддадзены небу,
Крыжамі рэлігій прабітаму,
А сэрца —
Раўня жывому небу,
Крывёю світанкаў налітаму.
Жывому жыццё дорыць Зямля —
Наш родны дом і падворак,
Як сэрца,
Яго падтрымлівае
Неба з пульсамі зорак,
Здольнае змясціць сусвет,
Трывогі, надзеі веку.
Гэтыя рысы неба —
У сэрцы чалавека.
Па сумленню
І зорцы палярнай,
Не схаваным пад цемрай павека,
Яшчэ мой паўночны прашчур
Свой шлях вызначаў адвеку.
Як меркаваць аб вялікім
Па звыклай зямной мерцы,—
Жыве любоў і братэрства

Сусветным прыцягненнем —
У сэрцы!
І, калі захлынецца,
Стаміўшыся, сэрца,
Механічнага, дактары,—
Не трэба.
Новы метад лячэння праверце —
Змясціце мне ў грудзі
Неба.

Зорнае жніва

З даўніны
Падлічваюць у небе зоркі,
Бы манеты звонкія,
Складваюць у скрыні астраноміі.
Імёнамі каханых называюць зоркі,
А зоркавымі —
Вырабы гастраноміі.
І ў знак пратэсту,
Незалежнасці асновай,
Неба
З галактычнага цеста
Лепіць
І зацяпляе свечку
Зверхновай.
А потым бачыць,
Як пад зоркамі абеліскаў
Аб кожным чацвёртым
Вечную памяць
Ад сэрца,
Ад болю
Беларусы запальваюць.
Рабы і захопнікі нам не трэба!
Нас вабяць загадкі,
Клічуць знаходкі.

Рукі сябра працягнуты небу
Праз нашы былінныя пяцігодкі.
І неба,
Надоечы недасягальнае,
Гордае неба,
Адкрыла з даверам
У вечны сусвет
Запаветныя дзверы.
Выйшаў народ наш спрадвеку руплівы
Дбайным аратым касмічнае нівы.
Узняты чалавецтвам на плечы
Сяброўства з небам,
Сусвет вечны,
Зорная доля зорнага хлеба.
Зямля
Ўглядаецца ў неба раўніва —
Звініць зярнятамі зорак
Жніва.

* * *

Спачатку быў невыразны зык
За поглядам пільным употай.
А потым вынайшаў слова язык.
Слова было потым!

Спачатку быў думак зоркавы пыл
На скронях кроплямі поту.
А потым слоў заркапад апаліў.
Слова было потым!

Спачатку быў крыўды нястрымны
палын,
Усю ахапіўшы істоту.

А потым горкага слова памін.
Слова было потым!

Спачатку быў нясцерпны боль,
Апёкшы знянацку, як шротам.
А потым слова паклікала ў бой.
Слова было потым!

Сапраўдныя дзеі не маюць прадмоў,
Вядомы адзіны ім клопат:
Сцяжынай сумлення—без лішніх слоў,—
Слова патомкаў потым!

Не ведаю, хто ты, складальнік асноў,
Мудрэц, папярэднік Гётэ!..
Прабач, паважаны пасрэднік вякоў,
Няхай будзе слова потым!

* * *

Ты казаў, што
ў сябра прасіў дапамогі.
Ён спаслаўся
на свой клопат.
Ты кінуў скрозь зубы:
— Яму шчэ адплачацца!

Ты казаў, што
ў ворага прасіў дапамогі.
Ён адвярнуўся:
— Ідзі... да сябра.
Ты пасміхнуўся:
— Недарма нарабіў яму прыкрасцяў!

Ты казаў, што
ў незнаёмага прасіў дапамогі.
Ён, бы сваяк, да цябе паставіўся.
Ты быў задаволены:
— Знайшоўся ж чулы чалавек!

А мне падумалася:
«Мо таму, што цябе не ведаў?»

* * *

Поўдзень.
Паветра святлом поўніцца,
выплеснутым з кубка сонца
на вуліцу.
Ідзе чалавек
між усмешак і гоману.
Ідзе.
І яму сумуецца.
Ідзе.
Палымнее крыўда ў душы —
чалавецтва зняважыла недаверам.
Было тую крыўду —
не затушыць —
закрылі прад ім
запаветныя дзверы.
Мо бляску надзеі
ў вачах не заўважылі?
Людзі, якія ж вы чарадзеі?
Ідзе чалавек:
чалавецтвам зняважаны,
у форменнай вопратцы,

што ўпершыню надзеў ён.
Ідзе, не зважаючы
на людскія натоўпы.
Застылая сляза,
як сонца асколак.
Меў чалавек сем няпоўных.
Быў не залічаны
сёння ў школу.

АНКЕТА

— Прафесія?
— Бач ты! Пішы — астраном!
— Прыгожая! Зоркі — сняцца?
— А як жа!
— А мне — без чаргі гастраном,
Куды я лячу пасля працы...
Так лёгка!.. Вучыліся дзе?
— У людзей.
— ?..
— Сузор'і вачэй адкрываю:
Сузор'і цяпла і сузор'і надзей,
Сузор'і сяброўскага краю...
— Ну што вы?! Ці ж нельга сур'ёзна?
Мая
Анкета — не месца для мэты!
Мне — дакументы!
— Папера — не я!
— Дык што? Запісаць вас паэтам?

ЗВАДКА

Не анёл я? —
Што праўда, то праўда.
Гэты тытул ніяк не па мне.
Не дарунак я?
Божачкі, рада!
У цябе — і за цацку? О, не!
Не царыца? —
І тут не багата.
Я змагла б за яе, толькі зволь,—
На сям'ю, ды на службу, ды хату
Не царыца патрэбна, а вол.
Што яшчэ? Пагаджуся наперад.
Не сярдуй, але ўсё не кране,
Бо табою мне дадзена вера,
Што жывая жанчына ўва мне.
Жыватворнае моцы крыніца
Нас пакліча засмяглай парой.
Прыпадзем, каб ніяк не напіцца,
Ціха скажаш мне: «Цуд мой. Царыца».—
«І анёл?» — «І дарунак ты мой!»

* * *

Дзе ты, мой любы, адзіны?
Грукае ў скроні гадзіннік,
І абцугамі чакання
Сэрца сціскае каханне.
Стомай напружаны жылы...
Крокі! Ды зноўку чужыя...
Дзе ён? Хутчэй толькі б ведаць!

Мрояцца розныя беды...
Крокі! Яго! Дзякуй богу!
Птушкай лячу да парога.
Вось ён. Цалюткі, лагодны!
— Дзе ты блукаеш, нягодны?!

ПАЛАНЯНКА

Ад пліты і ад люстэрка
На работу бегла ранкам.
Раптам думка-паняверка:
«Паланянка, паланянка!
У штодзённае турботы,
У вячэры ці сняданка,
У надзеі ці згрызоты —
Паланянка, паланянка.
У любові, дзе паўстане
Зноў сцяной неспадзяванка,
У сустрэчы і расстання —
Паланянка, паланянка.
І ва ўласнага дзіцяці
Ад світанку да світанку
З той пары, як стала маці,—
Паланянка, паланянка.
Што за путы? Не разрубіш!..»
Толькі ўсмешка-нечаканка:
«А ці свой палон уступіш?
Эх ты, гора-паланянка!»

ЧАБАРОВЫ ВЕЧАР

1

Чарнаброваю сваёй
Зачарованы,
Ходзіць хлопец пад зарой
Вечароваю.
Вечаровая пара,
Чабаровая,
Выйдзі, выйдзі са двара,
Чарнабровая!
Там сабака сцеражэ
Хату новую,
Толькі болей беражэ
Чарнабровую!
На дзяўчыніных бацькоў
Хопіць хітрасці,
Ды не знойдзеш ад клыкоў
Звера літасці.
Раз адважыўся Ігнат:
Не за кратамі!
Цераз тын махнуў у сад,—
Ходзіць з латамі.
Прыручаў яго Ігнат
І кілбаскаю.
З'есці — рад, а брэша гад!
Дзе тут з ласкаю?!
Да акна, ды што акна,
Нават ганачка,
Не падпусціць давідна.
Выйдзі, Ганначка!
Чарнабровую сваёй
Зачарованы,
Ходзіць хлопец пад зарой
Вечароваю.

2

Неадчэпны вечар,
Нецярплівы вецер
Доляй чабароваю
Вабяць чарнабровую.
Узляціць фіраначка:
«Не марудзь жа, Ганначка!»
Месяц трубіць у ражок:
«Зачакаўся твой дружок!»
Вечаровая пара,
Чабаровая,
Кліча, кліча са двара
Чарнабровую.
Мроіцца Ганулі,
Што бацькі паснулі.
Думка завіхаецца:
«Гнат не дачакаецца!»
Сэрцайка, не выскачы!
Мамачка, не высачы!
І нячутна, як звярок,
Да дзвярэй зрабіла крок.
Вечаровая пара,
Чабаровая,
Кліча, кліча са двара
Чарнабровую.
Што ж, адказ трымаць ёй,—
Ля парога маці:
«А куды ж ты ладзішся,
Поцемкамі крадзешся?
Глянь, і хуста новая!
Ну, дачка, бядовая!»
Ганна ў жаху: «Я пайду
Да крыніцы па ваду».
Вечаровая пара,
Чабаровая,

Кліча, кліча са двара
Чарнабровую.
«А ручай,— не крама,
Не закрыты, мама!
Штосьці смягне цела ўсё,
Піць мне захацелася!»
Маці ў вёдры глянула:
«Недарэмна ганіла!
Праўду мне кажы,— куды?
Вёдры ж поўныя вады!»
Вечаровая пара,
Чабаровая,
Кліча, кліча са двара
Чарнабровую.
Ганна ёй адразу:
«Ды з паліцы газу
Кошка ў вёдры скінула,
Каб жа, шэльма, згінула!»
Кажа маці: «Ганначка,
Хіба нельга ранячкам?» —
«Па ваду,— не па бяду,
Хутка, мамачка, прыйду!»
З вечаровае пары,
Чабаровае,
Прычакалі на зары
Чарнабровую.

ПРАМОВА ДЗЕДА АНТОСЯ

Я хату меў, каня, цяля.
І кожны знаў Антося.
Гуляць? Ну што ж, і я гуляў.
Каму не давялося?

Дзяўчаты лезуць пішчалём,—
У гаспадыні мецяць!
Нат абзавёўся быў шчанём,—
Не горш за ўсіх на свеце!
Гуляць — гуляў. А ў хату — не!
Як выганіш іх потым?
Любая пойдзе за мяне,
А ўсё нажыта потам!
Я заляцаўся да адной.
Ну, прыгажуня! — Люся!
І нават вырашыў: вясной
Вазьму і ажанюся.
Але кажу сабе: чакай!
За мной дзяўчаты скокам,
А Фрося, Саўкава дачка,
Не кіне нават вокам!
Ды хоць сама была б дарма?
Ну, толькі — не пачвара!
Як хлопцы кажуць,— што няма
Ні твару, ні тавару.
На гэткі здзек не знойдзеш слоў,
Не жартачкі, не цацкі!
Я ашалеў — заслаў сватоў
Да Фросінага бацькі.
Ды круціць Саўка рыжы вус
І кажа:
— Не, Антосю.
Не па сабе нацэліў кус,
Не ведаеш ты Фросю.
Ну я да Фросі. Зводзіць дых.
— Пайшлі ка мне дахаты?!
Яна:
— Чапляй, Антось, другіх.
Не трэба нам багатых.
Зусім я, людцы, ашалеў,
Крычу ў запале Фросі:

— Не гэткіх бачыў каралеў!
Яшчэ сама папросіш!
...Праходзіць тыдзень. І другі.
І трэці. Не стрываю!
Нудота цісне, бы даўгі.
Ізноў бяда старая!
Прыйшоў да Фросі:
— Ну, даруй,
За ганьбу і за крыкі.
Ты, Фрося, болей не сярдуй.
Дурны я, хоць вялікі.
Мо ўсё-ткі пойдзеш за мяне? —
А сам сціскаю зубы.
— Мой лёс мяне не абміне.
Не ведаю — ці любы?
Увосень дам табе адказ.
Чакай, калі ахвочы!
Ледзь не падскочыў. Вось дык раз!
Зірнуць баюся ў вочы.
Не перадумала б яна!
Імчу хутчэй дадому.
Тры дні праспаў, нібы сп'яна,
Такую меў я стому.
А на чацвёрты дзень ізноў
Не спіцца і не есца.
А вось адмовіцца ад слоў?
І не знаходжу месца.
Прыбег.
— Збірайся! На бяду,
Я тут зашмат балакаў!
Пайшлі! Бо Люсю прывяду!
Яна ў адказ:
— Ужо іду.
...Тут дзед Антось заплакаў.

* * *

Цераз усе слупы перасцярогі,
Дзе боль адвечны стоена прымоўк,
Дай божа, каб для дальняе дарогі
На гэты свет радзіўся ты, сынок.
Ну што казаць — я маці, як і ўсе,
Бо ганарылася няўмелым нават сынам.
Ты набіраўся моцы пакрысе,
Мяне падпарадкоўваў ты часінай.
За модаю збягаў ты ад мяне,
Пярэчыў мне і ўпарціўся нямала.
І ведала я — долі не мінеш.
Як птаха вольнага, цябе я гадавала.
Парою гадавала і няўмела,
Але не брала сэрца на замок.
Усё табе аддадзена, што мела,
Шукай жа сам, дзе спраўдзішся, сынок.
Што б мы ні сеялі ў надзённае сяўбе,
Усе мы — то падсудныя, то суддзі.
Прыйшла пара праверыць і цябе.
Ідзі, мой верш, ідзі, сынок, у людзі.

ЛІСТ БЕЗ АДРАСА І АДРАСАТА

Каханне маё,
Святло маё,
Свет мой!
Мір табе!
Пішу і не ведаю —
дастанеш ты па праву
маё хваляванне

з паштовай скрыні
ці ўвішныя гаспадыніны рукі.
Не выдай, паштовая скрыня!
Не здрадзь мне, ліст папяровы!
Каханне маё,
мой клопат,
як хлеб надзённы,
я магу пазваніць табе
і нават прыдумаць падставу
для нашай сустрэчы.
Я і раблю гэта.
Званю да цябе,
нібыта ў другую дзяржаву.
Сустракаюся,
каб хутчэй развітацца,
баючыся,
каб парушынка майго неспакою
не запала ў цябе.
Але зараз,
калі ноч абуджае ад сну летуценні,
мне так жадана гаварыць з табой,
што яшчэ я пішу.
Пішу, каб сказаць адзінае
вечнымі словамі болю і радасці,
смутку і жалю:
Каханне маё,
Святло маё,
Свет мой,
Мір табе!

У ЦЯГНІКУ

Будзённыя турботы перакрэслю,
Бо чым давер'е гэта аплачу? —
Даверыўшы свой сон майму плячу,
Спіць падарожнік у суседнім крэсле.
Дзе ты, пярсцёнкаў шлюбная сцяна?
Магчыма, хтосьці думае: «Каханка!»
А на душы такая чысціня,
Што спеліцца на вуснах калыханка.
Разгорнута «Вячорка» на грудзях.
Шумлівыя, стракатыя навіны!
Бянтэжыць нюх дакучліва-наіўны
І недарэчны тут друкарскі пах.
Рука замлела. Горача ў панчо.
Замры ў імгненні, рух неасцярожны.
Хай знае незнаёмы спадарожнік —
Не падвядзе жаночае плячо.

АСАДА ЧАСУ

Час руйнуе ў памяці сляды,
Нам узрост наважвае на плечы,
Сам — ні малады і ні старэчы,
Вечнасць — не падлічвае гады.

Абрастаюць жвірам гарады,
Зарастаюць рэчышчы травою,
Час вядзе асаду без адбою,
Што яму — адчайныя гады?

Вырашае: быць альбо не быць
Нашым уваходзінам балесным?

І калонай з чыстага жалеза
Помнік часу ў Індыі стаіць.

Хто яго з праклёнам ці заклёнам
Вырваў у часовае рукі?
Што хацеў сказаць нам праз вякі
Гэтай нержавеючай калонай?

Хто апошнім ведаў таямніцу
Нерушнай калоны за мяжой?
...Мне чамусьці бачацца за ёй
Горкія хатынскія званіцы...

Дзе дымілі мірна каміны,
Мо калона гэта, нібы вета,
Паднялася з попелу вайны
На крыві людское — запаветам?

Там, дзе глеба марыць аб сяўбе
Для людзей маленькае планеты,—
Пустазеллем множацца ракеты,—
Чалавецтва цэліцца ў сябе.

Горды час нарашчвае віток
У спіраль бясконцую няспешна,
Толькі час усё-такі залежны,
Ён бярэ ад хуткасці выток.

З дрэва чалавецтва і надзей
Адлятаем долу, нібы лісце.
Паратунак наш і наша выйсце —
Хуткасць нашых дум і нашых дзей.

Мы былі адвеку — вынаходцы,
Розум наш не спісаны ў запас!
Дыхае ў патыліцу нам час.
Чалавек, узбройся бессмяроццем!

ЗМЕСТ

Па дарозе ў Ялізава 5
Спадчынныя кросны 5
Партызанскі дуб 6
Беларусы 8
Па зоркавую долю 9
Снег у канцы красавіка 9
*** Прамень дрыжаў, цягнуўся да вады... 10
На Суі 11
Нораў восені 12
Непагодным днём 12
*** — Мама, дай квяцістай хусткі?.. . 13
Вяртанне да рамонкавай паляны 14
Абуджэнне 15
*** Чакала цябе... 15
*** Тры прыступкі — твае і мае... 16
*** Пад коламі спеў асфальта... 17
*** Травы духмяныя... 18
Але... 18
*** Яшчэ чутно цяпло далоні... 19
Казка 19
*** Ці было?.. 21
*** Я не прыйду... 21
*** Абудзіць пацалункам на золку... . . 22
Каралі 23
*** Ізноў я казку... 24
На сустрэчу выпускнікоў 24
*** Яшчэ не ведаю я... 25
Табе 26
*** Ёсць горыч у апошняе любові... . . . 27
*** Калі раптоўна пахіснуся... 27

*** — Пойдзем, пойдзем сынку... 28
Будзень адзіноты 28
*** Ушчувала мама... 29
Жыццё і творчасць 30
На беразе Буга 31
Дакор зубру 32
Промні і камяні 33
Трыпціх неба 34
*** Спачатку быў невыразны зык... . . . 38
*** Ты казаў, што... 39
*** Поўдзень... 40
Анкета 41
Звадка 42
*** Дзе ты, мой любы, адзіны?.. 42
Паланянка 43
Чабаровы вечар 44
Прамова дзеда Антося 46
*** Цераз усе слупы перасцярогі... 49
Ліст без адраса і адрасата 49
У цягніку 51
Асада часу 51

Паўлікава Л.

П 12 Адведзіны рамонкавай паляны: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1985.— 54 с. (Першая кніга паэта).

25 к.

Лірычнай споведзі Людмілы Паўлікавай уласціва цікавасць да сённяшняга жыцця, адданасць Радзіме, любасць да народнай песні. У кнізе чытач знойдзе вершы пра хараство роднай зямлі, пра высокае пачуццё кахання, пра вернасць і сяброўства.

П $\frac{4702120200-012}{М\ 302(05)-85}$ 88—85 ББК 84Бел7

Бел 2

Первая книга поэта
Людмила Федоровна Павликова

ПОСЕЩЕНИЕ РОМАШКОВОЙ ПОЛЯНЫ

Стихи

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар Л. В. Дранько-Майсюк. Мастак Ул. М. Жук. Мастацкі рэдактар А. М. Малышава. Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч. Карэктар Т. Ю. Гузава.

ІБ № 2153
Здадзена ў набор 04.07.84. Падп. да друку 11.11.84. АТ 06645. Фармат 70×90$^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 2,05. Ум. фарб.-адб. 3,58. Ул.-выд. арк. 2,17. Тыраж 2000 экз. Зак. 536. Цана 25 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

25 к.

Мінск «Мастацкая літаратура» 1985

